**Святлана Майсяйчук, намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:**

— Для нашага ўніверсітэта надзвычай актуальная тая ініцыятыва, з якой выступіў у гэтым годзе старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ акадэмік Анатоль Рубінаў, аб далучэнні іншых ВНУ, дзе ёсць творчыя спецыяльнасці, да такой жа сістэмы падліку балаў абітурыентаў, якая ў апошнія гады выкарыстоўвалася ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Па-першае, таму што ў БДУКіМ 12 з 16 спецыяльнасцей і 25 з 41 напрамкаў прадугледжваюць экзамен па прадмеце "Творчасць". А па-другое, у нас ёсць такія спецыяльнасці (напрыклад, усе спецыяльнасці факультэта музычнага мастацтва), дзе абітурыентамі з'яўляюцца толькі выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У музычных вучылішчах, каледжах мастацтваў асноўная ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы да будучай спецыяльнасці, а не па агульнаадукацыйных прадметах, і тым больш не да здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Па гэтай прычыне выпускнікі ССНУ, якія найбольш прафесійна падрыхтаваныя і творча адораныя, могуць паказваць адносна невысокія вынікі па прадметах тэсціравання. Існуючая сістэма падліку балаў не дазваляе гэтай катэгорыі абітурыентаў набраць неабходную колькасць прахадных балаў.

Аналізуючы вынікі ўступнай кампаніі, прыёмная камісія адзначае кожны выпадак, дзе ўніверсітэт губляе творча адораных маладых людзей, месца якіх займаюць абітурыенты, што паказалі адносна невысокі ці сярэдні ўзровень творчасці, але высокі ўзровень агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі. Магу праілюстраваць гэта на тыповым прыкладзе. Абітурыент А., які паступае на напрамак спецыяльнасці "Рэжысура свят", атрымлівае па ўсіх трох творчых іспытах па 9 балаў, але ЦТ і дакумент аб адукацыі даюць яму толькі 14 балаў. Другі абітурыент, назавём яго В., здаў творчыя іспыты на 7, 7, 6, затое астатнія адзнакі ў суме далі яму 21,5 бала. У выніку залічаны абітурыент В., а А. не праходзіць па конкурсе. Элементарныя разлікі паказваюць, што пры той сістэме, якая зараз прымяняецца ў акадэміі мастацтваў і ў акадэміі музыкі і якую мы хацелі б выкарыстоўваць у БДУКіМ, студэнтам стаў бы першы абітурыент, які, на наш погляд, гэтага больш заслугоўвае.

Бывалі выпадкі, што не праходзілі па конкурсе нават асобы з чырвоным дыпломам ССНУ менавіта з-за таго, што мелі нізкія балы сертыфікатаў па дзяржаўнай мове і гісторыі Беларусі. Прычым не скажаш, што яны сапраўды не ведаюць гэтых прадметаў: проста ў каледжах, паўтару, навучэнцы не трэніруюцца здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне, якое з'яўляецца спецыфічнай формай праверкі ведаў. Зазначу, што студэнты ўсіх факультэтаў і спецыяльнасцей БДУКіМ вывучаюць гісторыю Беларусі на першым курсе, і нават калі нехта нечага недавучыў, то ён дапоўніць свае веды ўжо ва ўніверсітэце. Акрамя таго, гісторыя Беларусі спасцігаецца ў вучэбным працэсе праз знаёмства з музычнымі творамі айчынных аўтараў, праз пастаноўку твораў беларускіх драматургаў. Мова таксама вывучаецца ва ўніверсітэце. Тым не менш звыш 60% вучэбнага плана складаюць усё ж дысцыпліны спецыяльнасці і спецыялізацыі. Нездарма ў апошні час у нас зарэгістравана некалькі выпадкаў, калі з творчых спецыяльнасцей студэнты пераводзяцца на "Менеджмент": яны не дацягваюць у дысцыплінах спецыялізацыі. Талент перш за ўсё! Астатняму навучым.



**Святлана Майсяйчук:** *"Талент перш за ўсё! Астатняму навучым".*